МІЖНАРОДНЫ КАНГРЭС ДАСЛЕДЧЫКАЎ БЕЛАРУСІ

**Аргкамітэт Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі абвяшчае збор індывідуальных заявак для ўдзелу ў V Кангрэсе, які адбудзецца 2-4 кастрычніка 2015 года ў г. Коўна (Літва).**

Дэдлайн падачы заявак — **18 мая 2015 года.**

*Кангрэс з'яўляецца самай прадстаўнічай беларускай штогадовай акадэмічнай і экспертнай падзеяй, у працы якога прымаюць удзел усе асноўныя інтэлектуальныя цэнтры даследавання грамадства, палітыкі і культуры Беларусі. Акрамя гэтага, правядзенне Кангрэса 'яўляецца выдатнай магчымасцю для распрацоўкі новых жыццяздольных даследчых і грамадскіх праектаў, абмену думкамі і ідэямі, усталявання нефармальных кантактаў з прадстаўнікамі экспертных і акадэмічных супольнасцяў Беларусі і другіх краін.*
*Місія Кангрэса – развіццё супольнасці навукоўцаў, аналітыкаў і экспертаў, а таксама спрыянне больш глыбокаму разуменню Беларусі ў акадэмічных асяродках краіны, рэгіёну і свету.*
Прыняць удзел у Кангрэса можна ў якасці **выступоўцы** (для гэтага трэба прадставіць тэзісы памерам 2-4 тыс. знакаў) ці **госця** без даклада. Можна таксама падаць заяўку на **арганізацыю** прэзентацыі навуковых, культурных, выдавецкіх праектаў, выставаў і г.д. Арганізацыйны камітэт вітае ўдзел у Кангрэсе журналістаў і прадстаўнікоў СМІ.

Спасылка на запаўненне анкеты рэгістрацыі **для ўдзельнікаў з дакладам:** https://palityka.wufoo.eu/forms/application-form-for-speakers/

Анлайн-рэгістрацыя **для СМІ**: https://palityka.wufoo.eu/forms/application-form-for-media/

Анлайн-рэгістрацыя **для гасцей, арганізатараў публічных мерапрыемстваў** (выстаў, прэзентацый), **валанцёраў:** https://palityka.wufoo.eu/forms/application-form-for-guests-and-others/

Ніжэй прапануем вашай увазе спіс тэматычных блокаў

1. Міжнародныя адносіны і знешняя палітыка
2. Палітычныя інстытуты. Эканамічная палітыка
3. Навука і адукацыя
4. Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага
5. Кніжная культура Беларусі: гісторыя і тэорыя
6. Гісторыя Беларусі XIXі XX стагоддзяў
7. Літаратуразнаўства і лінгвістыка
8. Філасофскія даследаванні і інтэлектуальная традыцыя Беларусі
9. Псіхалогія. Сучасны стан, праблемы і перспектывы псіхалогіі развіцця ў Беларусі
10. Гісторыя царквы
11. Сучасная беларуская культура
12. Антрапалогія, этнаграфія і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны
13. Гендэрныя "правілы": дыскурсы, палітыкі і практыкі
14. Юрыспрудэнцыя і правы чалавека

З падрабязным спісам тэматычных блокаў і панэляў і іх апісанняў можна **азнаёміцца тут**.